Rzeczypospolitej Polskiej. – 1925. – № 45 – S. 633–635.
8. *Pasko, A*. Polski Komitet Olimpijski w okresie stalinizmu / A. Pasko // Dzieje Najnowsze. – 2010. – № XLII – S. 1–2.
9. «Rosporządzenie Ministra Zdrowia Publicznego oprzedmiocie powołania Rady do Spraw Wychowania Fizycznego i Kultury Cielesnej»: opowołaniu Rady do Spraw Wychowania Fizycznego i Kultury Cielesnej // Monitor Polski. – 1920. – 19 stycz. – S. 1.
10. «Rosporządzenie Ministra Zdrowia Publicznego w sprawie utworzenia Państwowego Urzędu Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego»: o powołaniu Państwowego Urzędu Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego // Monitor Polski. – 1927. – 3 lut. – S. 1–2.
11. *Szujecki, K*. Życie sportowe w Drugiej Rzeczpospolitej / K. Szujecki. – Warszawa: Bellona SA, 2012. – S. 45.
12. *Topolski, J*. Historia Polski / J. Topolski. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie sp. z o.o., 2015. – S. 301.
13. Wielka Ilustrowana Encyklopedja Powszechna: w 22 t. / red. W. Horzyca. – Kraków: Wydawnictwo Gutenberg, 1929. – Tom XVI. – S. 166–167.
14. *Wojtycza, J*. Państwowy Urząd Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego jako element koordynacji system bezpieczeństwa w II RP w latach 1927–1939 / J. Wojtycza // Bespeczenstwo. Teoria i praktyka / red. K. Budzowski. – Kraków: 2012. – № 2(VII) – S. 81.
15. *Wojtycza, J*. Studia i materiały z dziejów przysposobienia wojskowego w Polsce w latach 1918–1926 / J. Wojtycza. – Krakow : Wydawnictwo Naukowe Akademii Pedagogicznej, 2001. – S. 11–12.
16. *Wroczyński, R*. Powszechne dzieje wychowania fizycznego i sportu / R. Wroczyński. – Wrocław: Wydawnictwo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1979. – S. 266–274.

**(Дата падачы: 27.02.2019 г.)**

*Я. М. Ляпешкін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*Y. Liapeshkin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476):35.076«1905/1907»**

# ІНСТЫТУТ ГУБЕРНАТАРСТВА ВА ЎМОВАХ РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ)

# INSTITUTE OF GOVERNORSHIP IN THE CONDITIONS OF THE REVOLUTION OF 1905–1907 (ON THE EXAMPLE OF THE BELARUSIAN PROVINCES)

*У артыкуле прааналізаваны асноўныя заканадаўчыя акты, якія рэгламентавалі паўнамоцтвы ўладаў падчас надзвычайнага становішча. На прыкладзе беларускіх зямель адлюстравана дзейнасць інстытута губернатараў у рэвалюцыі 1905–1907 гг. Падлічана колькасць начальнікаў беларускіх губерняў, якія змяніліся за гэты перыяд.*
*Ключавыя словы: беларускія губерні; губернатары; Палажэнне 14 жніўня 1881 г.; Першая расійская рэвалюцыя; «Курлаўскі расстрэл».*

*The article analyzes the main legal acts that regulate the activity of the authorities during an emergency. The example of the Belarusian lands reflects the activities of the institute of*

*governors in the revolution of 1905–1907. It is estimated the number of heads of the Belarusian provinces, which have changed over this period.*
*Key words: Belarusian provinces; the governors; Law of 14 August 1881; the First Russian revolution; «Kurlovsky shooting».*

У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі стала ўзрастаць увага да мясцовага кіравання на чале з губернатарамі ў беларускіх губернях перыяду Расійскай імперыі [1; 2]. Актыўна прысвячаюць свае даследаванні эвалюцыі інстытута губернатарства расійскія навукоўцы [3; 4]. У той жа час недастаткова вывучанымі застаюцца такія аспекты, як дзейнасць губернатараў у надзвычайных умовах рэвалюцыі 1905–1907 гг.

14 жніўня 1881 г. расійскі імператар Аляксандр III зацвердзіў Палажэнне «Аб мерах па ахове дзяржаўнага парадку і грамадскага спакою» [5]. 4 верасня 1881 г. быў апублікаваны ўказ аб выданні гэтага Палажэння і абвешчаны стан узмоцненай аховы ў некаторых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках імперыі [6, с. 283–284] .

Згодна з Палажэннем права абвяшчэння тэрыторый у стане ўзмоцненай аховы належыла міністру ўнутраных спраў, а з яго згоды – і генерал-губернатарам. Па законе, у выпадку неабходнасці ўвядзення надзвычайнага становішча, губернатары і граданачальнікі маглі толькі паведаміць пра гэта генерал-губернатарам або міністру ўнутраных спраў. У сваю чаргу, міністр мог толькі аб’явіць становішча надзвычайнай аховы, а ўводзіў яго Камітэт міністраў з дазволу манарха. Акрамя таго заканадавец падзяляў паняцці надзвычайнай і ўзмоцненай аховы [5, с. 262]. Расійскі юрыст Ц. Ц. Міхеева лічыць, што першае было больш строгім [3, с. 113]. У сваю чаргу прававед У. А. Казлабаеў вылучае яшчэ «прамежкавы» стан, які вызначае паміж нармальным і выключным станам [4, с. 42].

У мясцовасцях, якія аб’яўляліся на становішчы ўзмоцненай аховы, правы і абавязкі па ахове дзяржаўнага парадку і грамадскай бяспецы ўскладаліся на генерал-губернатараў, а дзе іх не было – на губернатараў і граданачальнікаў. Гэтыя кіраўнікі мелі права забараняць народныя, грамадскія і прыватныя сходы; зачыняць гандлёвыя і прамысловыя ўстановы; абмяжоўваць знаходжанне пэўных асоб на тэрыторыях, абвешчаных на становішчы ўзмоцненай аховы і інш. [5, с. 262–263].

Фармальна, Палажэнне 1881 г. пашырала ўладу губернатара. Аднак на практыцы яго паўнамоцтвы абмяжоўваліся тымі правамі, якімі валодалі губернскія ўстановы, непадведамасныя Міністэрству ўнутраных спраў (МУС). Прыкладам могуць служыць губернскія казённыя палаты, якія кантралявалі выдаткі губернскай адміністрацыі [7, с. 372].

Закон 14 жніўня 1881 г. планаваўся як часовая мера і ўводзіўся на тры гады. Аднак ён праіснаваў да 1917 г. [3, с. 113].

Найбольш шырокае прымяненне Палажэнне 1881 г. знайшло падчас Першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. Аналізуючы дзейнасць губернатараў у гэты перыяд, расійскі гісторык Л. М. Лысенка заўважыла,

што рэвалюцыйныя падзеі заспелі многіх кіраўнікоў губерняў знянацку, і яны знаходзіліся ў нерашучасці. «На пачатку рэвалюцыі 1905 г., – адзначае даследчыца, – губернатары (за рэдкім выключэннем) аказаліся не гатовыя пайсці на жорсткія рэпрэсіўныя дзеянні з ужываннем зброі супраць дэманстрантаў у гарадах і сялян, якія падпальвалі памешчыцкія сядзібы, у вёсках. Менавіта ў гэты перыяд звыш 20 губернатараў былі забітыя альбо раз'юшаным натоўпам, альбо ў выніку тэрарыстычных актаў» [8, с. 104–105]. Таму не выпадкова, што «ліберальных» губернатараў замянілі на «больш жорсткіх і рашучых» [8, с. 105].

Падобнае развіццё падзей было характэрна і для беларускіх зямель. Паколькі ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях дзейнічалі шматлікія палітычныя партыі і арганізацыі рознай ідэалагічнай арыентацыі, становішча ў рэгіёне было напружанае. У якасці прыклада, можна згадаць, якім чынам 16 мая 1905 г. замест начальніка Мінскай губерні А. А. Мусіна-Пушкіна выконваць пасаду (в.п.) губернатара быў прызначаны П. Г. Курлаў [9, с. 153, 174]. Пра абставіны падобнай ракіроўкі П. Г. Курлаў пісаў ва ўспамінах. Яго папярэднік на губернатарскай пасадзе падчас вулічных шэсцяў у Мінску «не толькі не справіўся з гэтымі дэманстрацыямі, але быў уцягнуты ў адну з іх, прычым маніфестанты, падчас шэсця, скарысталіся чырвонай падшэўкай яго форменнага паліто, як рэвалюцыйнай эмблемай» [10, с. 57].

У сувязі з неспакойным становішчам начальнікі беларускіх губерняў адзін за адным хадайнічалі аб увядзенні стана ўзмоцненай аховы.

8 сакавіка 1905 г. віцебскі губернатар Б. Б. Гершаў-Флотаў даносіў міністру ўнутраных спраў аб сялянскіх хваляваннях і магчымых беспарадках у губерні і прасіў «не адмовіць у аб'яве гарадоў Полацка, Дрысы, Рэчыцы, Люцына, Себежа, Невеля, Гарадка, Лепеля і Веліжа з іх паветамі ў становішчы ўзмоцненай аховы, так як мера гэтая, пры цяперашніх умовах, уяўляецца, адзіна для стрымання ў самым пачатку ўзнікшых хваляванняў і агітацый» [11, арк. 4–5 зв.]. І ўжо 16 сакавіка 1905 г. міністр унутраных спраў абвясціў Віцебскую губерню ў стане ўзмоцненай аховы, «прызнаўшы неабходным узмацніць на працягу некаторага часу дадзеныя губернскай адміністрацыі правы па ахове грамадскага парадку і спакою» [11, арк. 1–1 зв.]. Атрымліваецца, што губернскія ўлады павінны былі ажыццяўляць рашэнні, якія прымалі ў С.-Пецярбургу ў тым ліку на аснове інфармацыі, якая паступала ад тых жа губернатараў.

29 жніўня 1905 г. магілёўскі губернатар М. М. Клінгенберг адправіў тэлеграму ў С.-Пецярбург таварышу міністра ўнутраных спраў Д. Ф. Трэпаву. У тэксце паведамлялася: «Забастоўка гандлёвых прамысловых устаноў скончылася. Чыгуначная працягваецца. Навучальныя ўстановы зачыненыя. Дырэктарамі атрымана распараджэнне [аб] звальненні выхаванцаў старэйшых класаў, якія ўдзельнічалі [ў] забастоўцы. Яны хадайнічаюць [аб] вы-

сылцы іх з Мінска. Яшчэ раз хадайнічаю [аб] увядзенні ўзмоцненай аховы» [12, арк. 13].

Урад абвяшчаў Віленскую губерню ў становішчы ўзмоцненай аховы ў пачатку XX ст. яшчэ да 1905 г. Як адзначаў сучаснік віленскі губернатар К. К. Пален, «мера у той час нідзе не ўжытая на цэлую вобласць» [13, арк. 134, 144].

К. К. Пален падкрэсліваў, што дамагчыся параўнальнага заспакаення насельніцтва губерні ў 1904 г., яму ўдалося «дзякуючы падтрымцы сп. галоўнага начальніка краю князя П. Д. Святаполк-Мірскага». У сувязі з чым губернатар сам «хадайнічаў аб зняцці ўзмоцненай аховы, захаваўшы яе толькі для г.г. Вільні і Смаргоні». «На жаль, з прыбыццём новага генерал-губернатара генерал ад інфантэрыі Фрэзе, – скардзіўся К. К. Пален, – я пазбавіўся той падтрымкі і даверу начальніка краю, якія мне палягчалі задачу і давалі магчымасць трымаць у руках неспакойныя элементы горада». Менавіта саступкі грамадскасці з боку віленскага генерал-губернатара, на думку К. К. Палена, замаруджванне і не прыняцце жорсткіх мераў, прыхільнікам якіх быў віленскі губернатар, і спрыяла рэвалюцыйнасці ў Вільні ў кастрычніку 1905 г. [13, арк. 134–144]. Такім чынам, аказваць уплыў на сітуацыю ў губерні яе начальніку ўдавалася лягчэй ці наадварот складаней у залежнасці ад асабістых стасункаў з вышэйшым кіраўніцтвам.

З прычыны шматлікіх замахаў на службовых асоб было абвешчана палажэнне аб узмоцненай ахове ў Гродна ў красавіку 1905 г. [14, с. 49].

Яшчэ большую разгубленасць у шэрагі губернатараў унёс Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Аб гэтым згадваў віцэ-дырэктар Дэпартамента агульных спраў МУС С. М. Палеалог: «Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. заспеў знянацку нашу губернскую адміністрацыю і ваенныя ўлады. Ніхто не быў падрыхтаваны да гэтага акту, а першапачатковыя тлумачэнні дырэктывы з цэнтра, у асаблівасці старшыні Савета міністраў Вітэ, насілі больш чым ухілівы характар. Кожны разумеў “свабоду” па-свойму. У многіх месцах разгубленае начальства, баючыся не дагадзіць Пецярбургу, гатова было здаць уладу зазнаўшымся рэвалюцыянерам» [7, с. 383]. Выконваючы пасаду (в. п.) мінскага губернатара П. Г. Курлаў таксама лічыў, што «ў кожнай губерні маніфест вытлумачвалі і ўжывалі па-свойму, што адно ўяўляла ўжо вялікую небяспеку пры імкненні антыўрадавых партый тлумачыць маніфест у самым шырокім сэнсе» [10, с. 62].

Сёння відавочна, што Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. з’явіўся без кансультацый з губернатарамі. Апошнія атрымлівалі яго без папярэджвання і тлумачэння зместу. Нярэдка гэты дакумент станавіўся вядомым губернатарам з газет або вулічных плакатаў [15, с. 30].

В. п. мінскага губернатара П. Г. Курлаў успамінаў, што міністр унутраных спраў даслаў яму Маніфест 17 кастрычніка пазней, чым яго тэкст быў апублікаваны ў Мінску ў прыватнай друкарні [10, с. 61]. Таму ён выказваў крайнюю незадаволенасць несвоечасовым рассыланнем дакумента і бачыў

у гэтым «шкодныя для ўсёй Расіі наступствы». П. Г. Курлаў лічыў, што МУС павінна было даць губернатарам практычныя ўказанні аб тым як ім дзейнічаць пры вырашэнні пытанняў, якія ўзнікалі пасля апублікавання маніфесту [10, с. 62].

Начальнік Мінскай губерні рыхтаваўся зусім да іншага сцэнарыя развіцця падзей. 12 кастрычніка 1905 г. у сувязі з магчымымі забастоўкамі, в.п. губернатара П. Г. Курлаў правёў нараду, у тым ліку і з прадстаўнікамі ваеннага ведамства [16, с. 49]. «Начальнік губерні, адкрыў пасяджэнне, – гаварылася ў пратаколе нарады, – патлумачыўшы мэту склікання камандзіраў асобных вайсковых частак і ўказаўшы на тое, што ў выпадку вулічных беспарадкаў у г. Мінску неабходна іх неадкладна спыніць, хоць бы нават узброенай сілай...» [17; 18, арк. 5]. І, праз 6 дзён, 18 кастрычніка 1905 г. зброя была ўжыта. У выніку пацярпелі сотні мінчан. Гэтыя падзеі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай «Курлаўскі расстрэл».

Адносна датычнасці П. Г. Курлава да трагедыі, якая адбылася ў Мінску 18 кастрычніка 1905 г. існуюць розныя меркаванні. Адны даследчыкі лічаць, што начальнік Мінскай губерні «аддаў загад войскам без папярэджвання адкрыць агонь па ўдзельніках шматтысячнага мітынгу ў г. Мінску (18.10.1905), у выніку чаго былі забітыя і параненыя...» [9, с. 154]. Іншыя, спасылаючыся на мемуары, пішуць, што «сам П. Г. Курлаў распараджэння аб расстрэле дэманстрацыі на прывакзальнай плошчы не даваў» [19, с. 55]. Сапраўды, па сваіх паўнамоцтвах грамадзянскія губернатары не мелі ўлады над вайскоўцамі. Дазвол на дзеянне зброяй з боку грамадзянскай улады, не азначаў, што салдаты аўтаматычна адкрыюць агонь. Прыказ страляць аддаваў вайсковы камандзір [20, p. 197]. Аднак, як гаварылася вышэй, губернатар указваў ім на магчымасць навядзення парадку ўзброеным шляхам.

У законе ад 3 кастрычніка 1877 г. прапісана, што грамадзянскія ўлады маглі прызываць войскі для «папярэджвання альбо спынення народных беспарадкаў і хваляванняў» і – у некаторых іншых выпадках. Права прызыва войск належыла і губернатару. Пры народных беспарадках і хваляваннях указанне на ўжыванне зброі вайсковаму начальству давала грамадзянская ўлада. Але далей вайсковае кіраўніцтва распараджалася самастойна. Больш таго «…без указання грамадзянскага начальства, войскам дазваляецца выкарыстоўваць зброю падчас народных беспарадкаў і хваляванняў у крайняй неабходнасці…» [21, с. 160–161].

Такім чынам, ваеннае начальства адносна ўжывання зброі ў крайніх выпадках дзейнічала самастойна, ці, атрымаўшы ўказанне грамадзянскага кіраўніцтва на ўжыванне зброі, канчатковае рашэнне пакідала за сабой.

Так ці інакш правілы ўсталяваныя заканадаўствам у рэальным жыцці маглі парушацца. Нельга выключаць, што салдаты маглі не дачакацца каманды і пачаць страляць.

Між тым у данясеннях вышэйшаму начальству з Мінска паступалі абвінавачванні на адрас П. Г. Курлава. Але яму цэнтральная ўлада давярала

больш.

Дэпартамент паліцыі па асобаму аддзелу 27 кастрычніка 1905 г. сакрэтна паведаміў мінскаму губернатару змест тэлеграмы з якой старшыня агульнага сходу мінскіх адвакатаў і іх памочнікаў звярнуўся на імя старшыні Савета міністраў С. Ю. Вітэ: «18-га кастрычніка падчас радаснага мітынгу насельніцтва горада Мінска ў азнаменаванне дадзеных народу свабод, у момант, калі па закрыцці мітынгу народ стаў разыходзіцца, пасланымі губернатарам войскамі, без усялякага папярэджвання, быў адкрыты ў бяззбройны, мірны, натоўп бесперапынны агонь, за якім ішлі асобныя стрэлы з боку войскаў і паліцыі, якая забівала па-здрадніцку грамадзян на далёкай адлегласці ад месца мітынгу…» [12, арк. 67]. Ізноў эмацыйны аўтар памылкова адносіць у кампетэнцыю губернатара войскі.

12 лістапада 1905 г. в.п. губернатара, віцэ-губернатар Ф. Ф. Чарнцоў сакрэтна паведамляў у Дэпартамент паліцыі, што змест тэлеграмы старшыні агульнага сходу мінскіх адвакатаў і іх помочнікаў ад 27 кастрычніка на імя С. Ю. Вітэ «складае наўмыснае скажэнне фактаў і відавочную іх падтасоўку, з мэтай абвінавачвання адміністрацыйнай улады» [12, арк. 81].

Як адзначалася ў рапарце ваеннага следчага Віленскай ваеннй акругі па Мінскаму ўчастку палкоўніка Фішэра, толькі пасля правакацыйных дзеянняў маніфестантаў і прымянення імі рэвальвераў, каравул вакзала станцыі Мінск Лібава-Роменскай чыгункі пачаў страляць у натоўп [22, арк. 18–18 об].

Аб драматычных падзеях 18 кастрычніка 1905 г. у Мінску засталіся і сведчанні відавочцаў. «Таўпа пачала рухацца, каб пайсці паходам у места, – успамінаў беларускі палітычны дзеяч А. І. Луцкевіч, – калі раптам падведзены ззаду новы атрад войска распачаў – бяз ніякага папярэджвання – абстрэл таўпы» [23, с. 18].

Каб больш зразумела ўявіць маштабы таго, што адбылося, варта прывесці лічбы. Ахвярамі трагедыі сталі ад 50 да 80 чалавек, прычым большасць загінула ад куль у спіны і патыліцы [17].

У любым выпадку, тое што здарылася ў Мінску ляжыць на адказнасці П. Г. Курлава, ва ўладзе якога было забеспячэнне парадку і бяспекі на даручанай яму тэрыторыі. Невыпадкова трагедыя атрымала ў народзе назву «Курлаўскі расстрэл».

Пасля мінскіх падзей 18 кастрычніка 1905 г. П. Г. Курлаў па загадзе міністра ўнутраных спраў быў выкліканы ў С.-Пецярбург. Аднак, у выніку тлумачэнняў з начальствам, ён быў вернуты назад у Мінск [10, с. 66–68].

Па факце ўжывання зброі вялося расследаванне, аднак ніхто не панёс належнага пакарання [16, с. 55].

Варта адзначыць, што за перыяд службы ў Мінску на П. Г. Курлава двойчы здзяйсняўся замах, але ён застаўся жывы [10, с. 58, 70]. Паказальна, што ахранка ведала аб падрыхтоўцы другога тэракту і бомбу загадзя абясшкодзілі, і «каб не раскрываць свайго чалавека ў баявой арганізацыі

эсэраў, далі замаху адбыцца», але чамусьці не папярэдзіўшы П. Г. Курлава [19, с. 51]. У выніку эсэр-тэрарыст І. П. Пуліхаў, які кінуў у другім выпадку бомбу ў губернатара, пасля быў прысуджаны да смяротнага пакарання [2, с. 285]. У пачатку 1906 г. П. Г. Курлаў быў адкліканы ў С.-Пецярбург. 15 ліпеня 1906 г. на яго месца прызначылі Я. Я. Эрдэлі [9, с. 284].

Увогуле за студзень 1905 – чэрвень 1907 г. у Мінскай губерні змянілася тры губернатары. У Віленскай – тры: К. К. Пален (1902–1905), С. С. Тацішчаў (1905–1906), Д. М. Любімаў (1906–1912); у Гродзенскай – тры: І. Л. Блок (1905–1906), У. К. Кісцер (люты 1906 – чэрвень 1906), Ф. А. Зейн (1906–1907); у Віцебскай заставаўся адзін: Б. Б. Гершаў-Флотаў (1904–1911); у Магілёўскай –два: М. М. Клінгенберг (1902–1905), Д. Ф. фон Гагман (1905–1908) [24, с. 336; 25, с. 628–629, с. 401; 26, с. 122, 125, 128; 27, с. 511; 28, с. 777–779].

Замахі ажыццяўляліся і на іншых начальнікаў беларускіх губерняў. У прыватнасці, двойчы замахваліся на жыццё магілёўскага губернатара М. М. Клінгенберга і аднойчы – на віленскага губернатара К. К. Палена [14, с. 50].

Рэвалюцыйныя падзеі спрыялі ўзмацненню функцый начальнікаў губерняў на заканадаўчым узроўні. 29 лістапада 1905 г. быў выдадзены ўказ, які дазваляў губернатарам аб'яўляць становішча ўзмоцненай або надзвычайнай аховы і ўжываць надзвычайныя меры на падкантрольнай ім тэрыторыі ў выпадках збояў працы чыгункі, пошты ці тэлеграфа [29, с. 848–849]. Акрамя таго, яшчэ 1 мая 1905 г. яны атрымалі права выдаваць дазвол на набыццё нерухомасці ў беларускім краі асобам «польскага паходжання», што раней забаранялася. Як лічыць беларускі гісторык А. А. Падарожняя, гэтыя ўказы «далі губернатарам роўныя правы з генерал-губернатарамі» [1, с. 42]. Аднак з падобным сцверджаннем складана пагадзіцца. Хутчэй гэта сведчыла аб дубляванні правоў згаданых органаў улады, якое нярэдка вяло да непаразуменняў і канфліктаў.

Падчас рэвалюцыі вялікая роля адводзілася губернатарам і ў пытаннях кантролю за выбарамі. Згодна з Палажэннем ад 6 жніўня 1905 г. агульны кантроль над выбарамі ў Дзяржаўную Думу ажыццяўляла МУС, а на месцах – губернатары і граданачальнікі [30, с. 648]. Пры гэтым самі губернатары не маглі ўдзельнічаць у выбарах. Яны зацвярджалі размеркаванне выбаршчыкаў па ўчастках у гарадах, якое ажыццяўляла гарадская ўправа, маглі патрабаваць звесткі аб ходзе і парадку выбараў, назіраць за імі і карэктаваць іх правядзенне [30, с. 647–648]. Указам ад 4 сакавіка 1906 г. былі ўведзены ў дзеянне часовыя правілы аб таварыствах і саюзах [31], стварэнне якіх дазвалялася, толькі пры згодзе губернатара [31, с. 202].

Такім чынам, у надзвычайных умовах паўнамоцтвы губернатараў заканадаўча значна пашыраліся. Найбольш выразна гэта выявілася падчас Першай расійскай рэвалюцыі. Узмацнілася ратацыя кадраў: за перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. у беларускіх губернях змянілася

12 губернатараў. Выключныя меры, накіраваныя на падтрымку грамадскага парадку, прыводзілі да гвалту над насельніцтвам, і трагедый падобна «Курлаўскаму расстрэлу». У якасці зваротнай рэакцыі, губернатары нярэдка і самі станавіліся ахвярамі гвалту з боку апазіцыйна настроеных дзеячоў і арганізацый.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Подорожняя, Е. А.* Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. А. Подорожняя. – Минск, 2014. – 180 л.

2. *Бригадин, П. И.* Минские губернаторы: история власти / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с.

3. *Михеева, Ц. Ц.* Эволюция института губернаторства в Российской империи (историко-правовой аспект): дис. ... канд. юрид. наук: 12.00.01 / Ц. Ц. Михеева. – М., 2006. – 190 л.

4. *Козлобаев, В. А.* Институт губернаторской власти в механизме управления Российской империей, 1860-е – начало 1880-х гг.: историко-правовое исследование: дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / В. А. Козлобаев. – Тамбов, 2007. – 195 л.

5. О мерах к охранению государственного порядка и общественного спокойствия: Положение Комитета министров, 14 авг. 1881 г., № 350 // Полное собрание законов Российской империи (ПСЗРИ). Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1885. – Т. 1. – С. 261–266.

6. Об издании Положения о мерах к охранению государственного порядка и общественного спокойствия и объявления некоторых местностей Империи в состоянии усиленной охраны: именной указ Сенату, 4 сент. 1881 г., № 382 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1885. Т. 1. – С. 283–284.

7. *Шатохин, И. Т.* Кризисные явления в местном управлении Российской империи на рубеже XIX–XX вв. / И. Т. Шатохин // Проблемы отечественной истории: Источники, историография, исследования: сб. науч. ст. / Санкт-Петербургский ин-т истории РАН, Ин-т истории Украины НАН, Белорусский гос. ун-т; редкол.: М. Н. Барышников, А. В. Голубев [и др.]; отв. ред. М. В. Друзин. – СПб.; Киев; Минск: Нестор-История, 2008. – С. 370–389.

8. *Лысенко, Л. М.* Губернаторы и генерал-губернаторы Российской империи (XVlII – начало XX века) / Л. М. Лысенко. – 2-е изд. – М.: Изд-во МПГУ, 2001. – 358 с.

9. Минские губернаторы, вице-губернаторы и губернские предводители дворянства (1793–1917): биографический справочник / сост. Ю. Н. Снапковский; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: Беларусь, 2016. – 398, [2] с.

10. *Курлов, П. Г.* Гибель императорской России: Воспоминания / П. Г. Курлов. – М.: Захаров, 2002. – 301 с.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1430. – Воп. 2. – Спр. 705. Дело об объявлении в положении усиленной охраны гор. Полоцка, Двинска, Речицы и др. 24.03.1905 – 23.11.1910.

12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 60 П. – Воп. 3. – Спр. 95. Копии телеграмм, донесений Минского губернатора в департамент полиции, уездных полицейских управлений, исправников губернаторам о революционном движении в Минске, Минской и Могилевской губерниях в 1905 г. 31.12.1904 – 12.1905.

13. НАРБ. – Фонд 60 П. – Воп. 3. – Спр. 102. Переписка, телеграммы и донесения Минского, Могилевского и Витебского губернаторов, жандармских управлений в Департамент полиции о революционных выступлениях в Белоруссии 14.01.1905 – 23.03.1907.

14. *Киселев, А.* Бомба для генерал-губернатора: революционный террор и чиновники МВД белорусских губерний в 1905–1907 годах / А. Киселев // Беларуская думка. –

2008. – № 6. – С. 48–53.
15. *Роббинс, Р. Г.* Сатрапы? Вице-короли? Губернаторы? / Р. Г. Роббинс // Родина. – 1995. – № 6. – С. 28–30.
16. *Пичета, В. И.* Курловский расстрел в Минске (18 окт. 1905 г.) / В. И. Пичета // Каторга и ссылка. – 1926. – Кн. 4. – С. 49–55.
17. *Унучек, А. В.* Курловский расстрел / А. В. Унучек // Транспортный вестник. [Электронный ресурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://www.rw.by/corporate/press_center/reportings_interview_article/2012/06/kurlovskij_rasstrel/ – Дата доступу: 23.12.2018.
18. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 7611. Сведения о происходившей 18 октября 1905 г. демонстрации в гор. Минске у вокзала Либаво-Роменской железной дороги и о столкновении между демонстрантами и войсками. 31.121905 – 08.01.1906.

19. *Сергеенкова, В. В.* Воспоминания П. Г. Курлова как источник по истории первой российской революции / В. В. Сергеенкова // Первая российская революция 1905–1907 гг.: к 110-летию начала революционных событий: сб. ст. Междунар. науч. круглого стола, 25 ноября 2015 г., Минск / БГУ, Исторический фак., каф. истории России; редкол.: О. А. Яновский, В. В. Сергеенкова. – Минск: БГУ, 2015. – С. 46–61.
20. *Robbins, R. G.* The Tsar's Viceroys: Russian Provincial Governors in the Last Years of the Empire / R. G. Robbins. – Ithaca (New York); London: Cornell univ. press, 1987. – XVI, 271 p.
21. О правилах, определяющих порядок призыва войск для содействия гражданским властям: мнение Гос. совета, 3 октября 1877 г., № 57748 // ПСЗРИ. Собрание 2: в 55 т. – СПб., 1879. – Т. 52: Отд. 2. – С. 160–162.
22. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 7508. Дело о расстреле правительственными войсками манифестации в гор. Минске 18 октября. 17.10.1905 – 22.06.1906.
23. *Луцкевіч, А. І.* За дваццаць пять гадоў (1903–1928): успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. І. Луцкевіч; паслясл. А. М. Сідарэвіча. – 2-е выд. – Мінск: БелСЭ, 1991. – 64 с.
24. Императорское Училище Правоведения и Правоведы в годы мира, войны и смуты / сост. Н. Л. Пашенный (78-го вып.). – Мадрид: Изд. Комитета правоведской кассы, 1967. – 457 с.
25. *Крылов-Толстикович, А. Н.* Придворный календарь на 1915 год: комментарии / А. Н. Крылов-Толстикович. – М., 2015. – 763 с.
26. Гродненские губернаторы (1801–1917 гг.): документально-биографические очерки / Т. Ю. Афанасьева, Р. Ф. Горячева, В. В. Швед. – Гродно: Гродненская тип., 2007. – 168 с.
27. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1801–1917) / Т. Е. Леонтьева [и др.]; сост. Т. Е. Леонтьева, Д. Л. Яцкевич; редкол.: А. К. Голубович (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелНИИДАД, 2009. – 524 с.
28. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917) / Е. К. Анищенко [и др.]; сост. Ю. Н. Снапковский, Д. Л. Яцкевич; редкол.:

Д. В. Яцевич (глав. ред.) [и др.]. – Минск: Беларусь, 2014. – 814, [12] с.
29. О предоставлении местным властям права прибегать к применению чрезвычайных мероприятий в случаях прекращения или замешательства в сообщениях железнодорожном, почтовом и телеграфном: именной указ Сенату, 29 нояб. 1905 г., № 26984 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1908. – Т. 25: Отд. 1. – С. 848–849.
30. О выборах в Государственную Думу: Высочайше утвержденное Положение, 6 авг. 1905 г., № 26662 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1908. – Т. 25: Отд. 1. – С. 645–651.
31. О временных правилах об обществах и союзах: именной указ Сенату, 4 марта 1906 г., № 27479 // ПСЗРИ. Собрание 3: в 33 т. – СПб., 1909. – Т. 26: Отд. 1. – С. 201–207.

**(Дата падачы: 30.01.2019 г.)**

*Я. В. Маслоўскі*
аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
*Y. V. Maslouski*
Graduate student at the department of modern and c contemporary
history of Belarus, faculty of history

**УДК 323.33(476)(091)”1907/1914”**

# УМОВЫ ПРАЦЫ І ВЫТВОРЧЫ ТРАЎМАТЫЗМ НА ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ У БЕЛАРУСІ ў 1907–1914 гг.

# LABOR CONDITIONS AND INDUSTRIAL INJURIES IN BELARUS IN 1907–1914

*На падставе архіўных і статыстычных крыніц праводзіцца аналіз няшчасных выпадкаў, якія адбыліся з фабрычна-заводскімі рабочымі ў Беларусі у пачатку XX ст. Вызначаецца дынаміка зменаў масштабу вытворчага траўматызму ў беларускіх губернях у перыяд з 1907 па 1914 гг. Параўноўваюцца ўмовы працы ў розных галінах вытворчасці прамысловасці ў Беларусі. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі паказваецца розніца ў масштабах вытворчага траўматызма ў галінах вытворчасці беларускіх губерняў.*

*Ключавыя словы: Беларусь; рабочы; прамысловасць; 1907–1914 гг.; пралетарыят; фабрычна-заводскі; беларускія губерні; вытворчы траўматызм; няшчасныя выпадкі; умовы працы.*

*On the basis of archival sources and statistical analyzes of accidents which have occurred with the factory workers in Belarus at the beginning of the twentieth century. It is determined by the dynamics of the scale of occupational injuries changes in Belarusian provinces in the period from 1907 to 1914. Compared working conditions in different sectors of industry production in Belarus. For the first time in the national historiography indicates the difference in the scale of occupational injuries in industries of the Belarusian provinces.*

*Key words: Belarus; Worker; Industry; 1907–1914 gg.; Proletariat; factory; Belarusian province; occupational injuries; accidents; working conditions.*

Для сучаснай гістарычнай навукі актуальнай праблемай для вывучэння з’яўляецца жыццё фабрычна-заводскіх рабочых у Беларусі як адной